Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# Сацыялістычная вёска

Орган Глускага РК КП(б)Б і Райсовета Дэпутатаў [illegible]

№ 21 (1179) | Аўторак, 1 Мая

**Няхай жыве Усесаюзная Комуністычная партыя большэвікоў, партыя Леніна-Сталіна--натхніцель і арганізатар барацьбы за перамогу над нямецка-фашысцкімі захопнікамі!**

## ЗВАРОТ

## Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Савецкага Саюза І. В. Сталіна да Чырвонай Арміі і войск саюзнікаў

Ад імені Совецкага Урада я звяртаюся да Вас,

камандзіры і байцы Чырвонай Арміі і армій нашых саюзнікаў.

Пабеданосныя арміі саюзных дзяржаў, якія вядуць вызваленчую вайну ў Еўропе, разграмілі германскія войскі і саедзініліся на тэрыторыі Германіі.

Наша задача і наш доўг—дабіць ворага, заставіць яго скласці зброю і безагаворачна капітуліраваць. Гэтую задачу і гэты доўг перад нашым народам і перад усімі свабодалюбівымі народамі Чырвоная Армія выканае да канца.

Вітаю доблесныя войскі нашых саюзнікаў, якія стаяць цяпер на тэрыторыі Германіі плячом к плячу з совецкімі войскамі і поўныя рашымасці выканаць свой доўг да канца.



## СВЯТА ПЕРАМОГ

Баявыя сілы совецкай краіны ідуць на першамайскі агляд загартаваныя ў баях, авеяныя славай ратных подвігаў воінаў на палях сражэнняў і працоўнай доблесцю совецкіх людзей у тылу, высока нясучых пераможны сцяг Леніна—Сталіна—сімвал нашай магутнасці, сімвал невычэрпальнай волі совецкага народа к перамозе.

[illegible] Армія сустракае дзень 1 Мая ў баях за канчатковы разгром фашысцкіх акупантаў. Гераічныя воіны Чырвонай Арміі акружылі сталіцу фашысцкага логава Берлін і вядуць паспяховыя баі на яго вуліцах.

Слава совецкім войскам, устанавіўшым сцяг перамогі над Берлінам!

Гераічная Чырвоная Армія сумесна з арміямі нашых саюзнікаў, ведучы вызваленчую вайну ў Еўропе, разграмілі германскія войскі і саедзініліся на тэрыторыі Германіі.

Слава совецкім войскам і войскам нашых саюзнікаў, саедзініўшымся на Эльбе ў цэнтры Германіі!

Працоўныя нашага раёна сустракаюць першамайскае свята новымі гераічнымі поспехамі на працоўным фронце.

Працоўныя нашага раёна ідуць на першамайскі агляд з баявым клічам:

—Усё для фронта, усё для завяршэння [illegible]!

## Урачыстае паседжанне Глускага горпасялковага Совета, прысвечанае дню 1 мая

30 красавіка ў святочна ўпрыгожаным Доме соцкультуры сабраліся прадстаўнікі партыйных і совецкіх арганізацый, грамадскіх устаноў, прадстаўнікі прадпрыемстваў і калгаснікі гарадскога пасёлка.

Доўга не змаўкаючымі апладысментамі, якія пераходзяць у авацыю, сустракаецца прапанова выбраць у ганаровы прэзідыум урачыстага паседжання Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з тав. І. В. Сталіным.

Даклад аб міжнародным рэволюцыйным свяце 1 Мая зрабіў сакратар РК КП)б)Б тав. Чарнушын.

Пасля ўрачыстага паседжання для прысутных адбыўся паказ багатай і разнастайнай праграмы мастацкай самадзейнасці школ і дзіцячага дома.

## АД СОВЕЦКАГА ІНФОРМБЮРО

### АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 28 КРАСАВІКА

Войскі 2-га БЕЛАРУСКАГА фронта сёння, 28 красавіка, з баямі авалодалі гарадамі ЭГГЕЗІН, ТОРГЕЛАЎ, ПАЗЕВАЛЬК, ШТРАСБУРГ, ТЭМПЛІН—важнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў у Заходняй Памераніі. У баях за 27 красавіка войскі фронта захапілі ў палон больш 1.000 нямецкіх салдат і афіцэраў і захапілі на аэрадромах 70 самалётаў праціўніка.

Войскі 1-га БЕЛАРУСКАГА фронта працягвалі весці вулічныя баі ў БЕРЛІНЕ і занялі паўночна-заходнюю частку гарадскога раёна ШАРЛОТЭНБУРГ да Бісмаркштрасэ, заходнюю палавіну гарадскога раёна ШЭНЭБЭРГ. У баях за 27 красавіка ў Берліне войскі фронта ўзялі ў палон больш 9.000 нямецкіх салдат і афіцэраў і захапілі больш 100 палявых гармат, 135 кулямётаў, 1.800 аўтамашын і 50 складаў з розпай ваеннай маёмасцю.

Войскі 1-га УКРАІНСКАГА фронта вялі вулічныя баі ў паўднёва-заходняй частцы БЕРЛІНА і занялі гарадскія раёны ФРЫДЭНАЎ, ГРУНЭВАЛЬД і РУЛЕБЕН і злучыліся з войскамі 1-га Беларускага фронта, заняўшымі СІМЕНШТАМ.

На паўднёвы ўсход ад БЕРЛІНА ў лясіста-азёрным раёне войскі 1-га БЕЛАРУСКАГА і 1-га УКРАІНСКАГА франтоў акружылі значную групу нямецкіх войск і вялі баі па яе знішчэнню.

У баях за 27 красавіка войскі 1-га УКРАІНСКАГА фронта ўзялі ў палон 18.000 нямецкіх салдат і афіцэраў, з іх 14.000 з састава акружанай групы немцаў на паўднёвым усходзе ад Берліна. Акрамя гэтага, войскі фронта захапілі наступныя трафеі: танкаў—55, палявых гармат—268, аўтамашын 2.150, паравозаў—39, чыгуначных вагонаў — 900, складаў з рознай ваеннай маёмасцю—150.

На тэрыторыі Чэхаславакіі, на ўсход і на паўднёвы ўсход ад горада БРНО, войскі 2-га УКРАІНСКАГа фронта, працягваючы наступленне, з баямі занялі населёныя пункты Паповіцэ Кунавіцэ, Жэравіцэ, Кіеў, Жарашыцэ, Рамавіцэ, Летаніцэ, Казланы, Багдаліцэ, Нэмаяны, Табравані.

На дргіх участках фронта істотных змен не было.

За 27 красавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 170 нямецкіх танкаў і самаходных гармат. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіт 41 самалёт праціўніка.

## Перадавікі перадмайскага соцспаборніцтва

КЛЕТНАЕ

У калгасе ім. Сталіна (старшыня тав. Марціновіч), было шырока разгорнута перадмайскае соцыялістычнае спаборніцтва. У выніку—другая брыгада калгаса (брыгадзір Шарамет Люба) выйшла пераможцам, закончыла сяўбу яравых каласавых культур на 24 красавіка. Перадавымі аказаліся звенні т. т. Кісляк Надзі і Мядзведкі Мар'і.

Закончыўшы сяўбу на сваім участку, другая брыгада ўзялася за дапамогу першай брыгадзе, і на 28 красавіка калгас закончыў сяўбу яравых каласавых культур.

***

ХВАСТАВІЧЫ.

—Хутчэй і лепш пасеяць яравыя! Дастойна сустрэць першамайскае свята!—пад такімі лозунгамі працавалі калгаснікі і калгасніцы калгаса „Юны барацьбіт", уключыўшыся ў першамайскае соцыялістычнае спаборніцтва (старшыня тав. Дробіў). Датэрмінова закончыўшы сяўбу яравых культур, к дню 1 Мая калгас выканаў план сяўбы льну на 50 процантаў.

***

ГАРАДОК. Калгас „Камуніст", (старшыня тав. Зінкевіч) закончыў сяўбу яравых каласавых і падныхтаваў глебу для пасеву льну.

Калгас „Чырвоная ніва" (старшыня тав. Храпка) таксама поўнасцю закончыў сяўбу яравых каласавых.

***

БЯРОЗАЎКА. К дню першамайскага свята закончыў сяўбу яравых культур і пасадзіў 5 га бульбы калгас „Чырвоная Беларусь" (старшыня тав. Баярка Ганна).

Адказны рэдактар
С. ШУМОЎСКІ.

ГО 05/33 АДРАС РЭДАКЦЫІ: Глуск, вул. Валадарскага, 3.